Конкурс сачыненняў
Магілёўская вобласць
Пархімчык Паліна Сяргееўна
Дзяржаўная ўстанова адукацыі “Сярэдняя школа № 26 г.Бабруйска”
VI “Б” клас

Мая Радзіма - Беларусь

Ёсць на свеце нямала прыгожых краін. Для мяне самая лепшая і любімая – Беларусь. Я нарадзілася ў гэтай краіне, шчыра і аддана люблю яе.

Колькі цудоўных паэтычных твораў прысвечана маёй Радзіме! Заўсёды ў сэрцы радкі з верша майго любімага паэта Петруся Броўкі: “Беларусь! Хто любоў да цябе можа змераць? Акіяны не маюць такой глыбіні”.

Я вельмі люблю Беларусь, мой горад Бабруйск, дзе я нарадзілася, дзе я адчуваю любоў сваіх бацькоў, сяброў, дзе незвычайна пяшчотна лашчыць мой твар веснавы ветрык, дзе духмяным водарам ап’яняюць улетку кветкі на паплавах ля славутай Бярэзіны, дзе сама зямля дорыць мне сілы і настрой, спакой і шчасце. Шчыра любячы свой край, я таксама складаю вершы, прысвечаныя яму, спадзеючыся калі-небудзь стаць сапраўдным паэтам:

Я не магу табой не любавацца,
Мой рай, мой край,
З маленства дарагі!
Я не магу табой не наталяцца,
Калі заліла сонейка лугі,
Калі вясной шчабечуць дзіўна птушкі,
Калі ўлетку травы п’юць расу,
Калі ўвосень стомленыя дрэвы
На дол скідаюць золата красу.
Калі зімою лютаю пад снегам
Твае палеткі спяць і бачаць сны.
Я не магу табой налюбавацца,
Мой рай, мой край,
З маленства дарагі!

Мой родны Бабруйск – самы лепшы для мяне горад. Ён лічыцца адным з самых старажытных у Беларусі. Першая згадка пра яго  адносіцца да 1387 года, знаходзіцца ў дагаварной грамаце вялікага князя Літоўскага і Рускага Ягайлы і яго брата Скіргайлы. Слаўная гісторыя майго горада звязана з асаблівасцямі яго геаграфічнага месцазнаходжання і багатымі ўгоддзямі, што не магло не прываблiваць заваёўнікаў. Цэнтрам абароны горада была Бабруйская крэпасць, пабудаваная ў 1810 годзе, якая зараз напаўразбураная, але ўсё ж прываблівае турыстаў сваёй гісторыяй. Цікава, што ў нашы дні на тэрыторыі Крэпасці адбываюцца фестывалі-злёты ваенна-гістарычных клубаў “Бабруйскі кацёл”.

Я вельмі ганаруся тым, што менавіта мой горад з’явіўся месцам, дзе падчас Вялікай Айчыннай вайны адбылася вядомая Бабруйская аперацыя

(“Бабруйскі кацёл”), у выніку якой Бабруйск быў вызвалены, а савецкія войскі змаглі паспяхова працягнуць далейшае вызваленчае наступленне.

Горад мае багатыя і разнастайныя культурныя традыцыі. У сучаснасці тут праходзіць Міжнародны фестываль народнай творчасці “Вянок дружбы”, Міжнародныя пленэры па кераміцы “Арт-Жыжаль”, Рэспубліканскі фестываль нацыянальнай драматургіі імя В.І. Дуніна-Марцінкевіча, такія этнасвяты, як “Пакроўскі абярэг”, “Купалле”, нават гастранамічны фестываль “СмакFEST”.

Мой любімы горад славіцца і вядомымі прадпрыемствамі. Я не магу не прыгадаць самае салодкае – “Чырвоны харчавік”, дзе вырабляецца найсмачнейшы ў свеце зефір і мармеладныя цукеркі.

Я вельмі люблю маю краіну Беларусь, мой горад Бабруйск, ганаруся і ўсведамляю, што мая будучая прафесія будзе абавязкова звязана з маёй зямлёй. Я буду ўсхваляць, аберагаць, мацаваць сваю Радзіму, каб яна квітнела і ніколі не ведала бяды.

Я адчуваю, што мая Радзіма – гэта мой лёс. Калі я думаю аб ёй, сэрца напаўняецца ціхай радасцю, спакоем, і радкі вырываюцца з глыбіні душы:

Мая любімая Радзіма - Беларусь,
Табой адзінаю я толькі ганаруся!
Ты ў сэрцы - боль, трывога, ты - спакой,
Бясконцасць, глыбіня, каханне.
Ты назаўжды, як маці, як зямля,
Як сонейка, як ноч, як дзень, як ранне.
Мая адзіная, мой лёс, мая зямля,
Ты маёй будучыні яснае світанне!

Я не магу не любіць сваю Радзіму, я шчыра прызнаюся ёй у сваіх пачуццях:

Люблю, - шапчу я палеткам тваім.
Люблю, - шапчу тваім гоням.
Люблю, - крычу я буслам увышыні.
Люблю, - спяваю азёрам.
Люблю, - прызнаюся я людзям тваім.
Люблю, - кажу роднай мове.
Люблю я цябе, мая Беларусь,
Ніколі не здраджу, ніколі!